паранена – 31 афіцэр і 637 унтэр-афіцэраў і радавых.

Насуперак гэтым стратам і адчайнай смеласці рускіх, цвёрды баявы дух дывізіі, атрымліваючай папаўненне ў асноўным з непасрэднай радзімы фюрэра і вышэйшага галоўнакамандуючага, з вобласці Верхняга Дуная, узорна вытрыманы да апошняга дня крывавых бліжніх баёў.

*Шліпер*

*Поступила в редакцию 14.02.11*

С.Я. Новікаў

# ПРАЦОЎНАЯ ЗАНЯТАСЦЬ ЖЫХАРОЎ ГРОДНА Ў 1941–1944 ГГ.

У артыкуле ўпершыню на новай базе дакументальных крыніц паказаны маштабы і вытворчая геаграфія выкарыстання на прымусовых работах жыхароў Гродна. Аўтар аднаўляе агульную карціну працоўнай паўсядзённасці ў акупаваным горадзе, ставячы ў цэнтр увагі мясцовае беларускае насельніцтва, палякаў і яўрэяў, вызначае асаблівасці іх выкарыстання ў прамысловай вытворчасці, гарадской рамеснай гаспадарцы і на работах у нямецкіх фірмах і г.д. На аснове ўвядзення новых дакументальных звестак удакладняецца агульная лічба аб колькасці мясцовага насельніцтва, прыцягнутага да прымусовай працы ў Гродна ў 1941–1944 гг. Аўтар высвечвае новае праблемнае поле па далейшым вывучэнні сацыяльнага становішчы розных працоўных катэгорый і нацыянальных груп з мясцовай рабочай сілы Гродна і Гродзеншчыны.

У найноўшай айчыннай гістарыяграфіі пытанне аб працоўнай занятасці жыхароў Гродна і насельніцтва Гродзеншчыны вядома ў большай ступені праз кантэкст даследавання гісторыі выгану беларускіх грамадзян на прымусовыя работы ў нацысцкую Германію. У канцы 1990-х гадоў у беларускай гістарычнай навуцы ў дачыненні мясцовага насельніцтва, якое з’яўлялася аб’ектам германскай эканамічнай палітыкі.на акупаванай тэрыторыі Гродзенчыны ў 1941–1944 гг,, пачалі ў рэшце абазначацца асобныя навуковыя погляды, адпаведна якім “эканамічны і працоўны патэнцыял горада немцы спаўна выкарыстоўвалі і бязлітасна эксплуатавалі для ўмацавання “трэцяга рэйха” [1, С. 366]. На думку гродзенскага гісторыка Э.С. Ярмусіка, з першых дзён акупацыі мясцовае насельніцтва было пераўтворана ў рабоў [1, С. 367], кажучы інакш – выконвала непасільную рабскую працу.

Паводле статыстычных даных, прыведзеных у гісторыка-дакументальнай хронікі горада Гродна, напачатку трэцяга 1943/44 гаспадарчага года ў горадзе было 38 тысяч жыхароў, з якіх 16 тысяч (ці 42%) былі заняты ў прамысловасці і рамястве [3, С. 366]. Годам раней агульная колькасць занятых на на дзеючых прадпрыемствах горада, аб чым сведчаць звесткі гродзенскай біржы працы, складала 18283 чалавекі, з якіх

мужчынскай рабочай сілы было 11 824 (у тым ліку кваліфікаваных рабочых – 5076 чалавек, спецыялістаў будаўнічай галіны і занятых у іншых галіновых групах – 6748 чалавек), працуючых жанчын – 6459 чалавек [2, Арк. 39]. У кастрычніку 1943 г. на ўліку біржы працы на тэрыторыі крайскамісарыяту (акругі) Гродна знаходзіліся 90 647 чалавек працаздольнага насельніцтва [3, Арк. 1 – 123], тады як у канцы першага 1941/42 гаспадарчага года яе дзейнасці агульная колькасць працуючага насельніцтва складала звыш 75 тысяч чалавек, уключна 25 326 чалавек, занятых у сельскай гаспадарцы [2, Арк. 39].

Адпаведна ўказу ад вядзенні эканомікі на навазанятых усходніх тэрыторыях, падпісанага Гітлерам 29 чэрвеня 1941 г, і згодна дырэктыўным указанням упаўнаважанага па чатырохгадовым плане Герынга ад 31 ліпеня 1941 г., да пачатку жніўня занятая вермахтам тэрыторыя Гродзеншчыны знаходзілася ў кампетэнцыі эканамічнага штаба Ост і падпарадкаванай яму эканамічнай інспекцыі "Цэнтр". На тэрыторыі акругі Беласток, у склад якой ўваходзіла Гродзеншчыны, з першых дзён ўсталявання германскай акупацыі з мэтай максімальнага выкарыстання выяўленых рэсурсаў, гаспадарчага патэнцыялу і забеспячэння германскай ваеннай эканомікі дзейнічалі гаспадарчыя службы нарыхтоўчай акругі "Варшава" [4, С. 154]. З 3 ліпеня літоўскія, польскія і беларускія вяскоўцы патрапілі ў фокус гаспадарчай палітыкі ўсходнепрускага гаўляйтара і оберпрэзідэнта Э.Коха, які атрымаў ад кіраўніка эканамічнага штаба усход дазвол на выкарыстанне мясцовага насельніцтва для правядзення сельскагаспадарчых работ [5, Bl. 837]. У выніку правядзення вярбовачных акцый з тэрыторыі акругі Беласток ў германскі рэйх да канца года было адпраўлена 20 000 мясцовых жыхароў [6, S. 458]. Па звестках эканамічнай інспекцыі Цэнтр, у сярэдзіне ліпеня 1941 г. у Гродна сярод неяўрэйскай рабочай сілы было выяўлена ад 5000 да 7000 беспрацоўных [7, Bl. 44]. У канцы года Кох выдае загад, адпаведна якому на тэрыторыі кожнага мясцовага камісарыяту, у тым ліку ўсіх крайскамісарыятаў акругі Беласток з працаздольнай мясцовай рабочай сілай павінны былі стварацца рабочыя лагеры [6, S. 493].

З дакументаў вынікае, на працягу першага месяца акупацыі жыхары Гродна і насельніцтва Гродзеншчыны апынуліся ў сферы дзейнасці германскай ваеннай адміністрацыі. Паводле нямецкіх дырэктыўных указанняў, на дзеючых мясцовых прадпрыемствах і ў мясцовых органах кіравання павінны былі захоўвацца існуючыя ў савецкі час нормы працы і тарыфы па заработнай плаце. Так, адпаведна загаду камандуючага групы армій "Цэнтр" ад 9 ліпеня на занятай тэрыторыі забаранялася павелічэнне заработнай платы і прэміяльных тарыфаў, якія не павінны былі змяняць агульныя палажэнні, дзеючыя на гэтай тэрыторыі да 22 чэрвеня 1941 г. [8, Арк. 5].

У пачатку жніўня для мясцовай рабочай сілы, якая працягвала працу ў новых умовах, дырэктывамі аб часовым рэгуляванні заработнай платы і ўмоў працы для мясцовага цывільнага насельніцтва, занятага на работах для

патрэб германскай эканомікі і ваюючага вермахта, уводзіліся вытворчыя нормы ваеннага часу [8, Арк. 5]. Працягласць рабочага дня для працуючых мужчын і жанчын павінна была складаць 8 гадзін, для моладзі да 16 гадоў – 7 гадзін. Уводзіліся расцэнкі, паводле якіх заработнай платы выплачвалася ў адпаведнасці з 8-мі класнай тарыфнай шкалой: для работнікаў 1–5 класаў была ўстаноўлена пагадзінная аплата працы, тады як для спецыялістаў 6, 7 і 8 класаў – месячны аклад. Памер заробку рабочых і служачых вызначаўся адпаведнымі тарыфамі: для 1 і 2 класаў пагадзінная аплата складала ад 0,80 да 1,25 рубля; для рабочых 3 класа была ўсталявана тарыфная норма ў 1,50 рублі. Аплата рабочых 4 і 5 класаў залежала ад ступені рабочай актыўнасці, таму вагалася ад 2 да 3 рублёў для кваліфікаванага рабочага і ад 3 да 4 рублёў за гадзіну працы – для майстара ці прараба. Служачыя мелі месячны адклад ад 300 рублёў для 6 і да 800 рублёў для 8 класа. Новымі дырэктывамі пры гэтым не праводзілася аніякай розніцы ў аплаце жаночай і мужчынскай працай. Моладзь ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў магла атрымліваць да 80%, ніжэй 16-ці гадоў – толькі 60% ад тарыфу, прадугледжанага для пэўнага кваліфікацыйнага класу. Былі ўстаноўлены пэўныя адлічэнні (падаткі, зборы, унёскі), якія складалі 6% для сумы ад 150 да 300 рублёў, 8% – ад 301 да 600 рублёў і звыш 600 рублёў гэты адлічэнні складалі 10%. Падаткі з заробкаў ніжэй за 150 рублёў не браліся. Паводле часовых дырэктыўных палажэнняў, яўрэям забаранялася атрымліваць грашовае заахвочванне. У якасці выключэнняў аплата работы яўрэяў дапускалася, але яўрэі маглі атрымаць толькі 80% ад тарыфнай нормы, пры гэтым 20% пералічваліся на спецыяльныя рахункі [9, Арк. 5 адв., 6, 6 адв.].

Пасля выхаду дэкрэта Гітлера ад 22 ліпеня 1941 г. аб перадачы ўлады органам цывільнай улады і ўключэння горада Гродна і тэрыторыі Гарадзеншчыны ў асобную акругу “Беласток” [6, S. 175], з 1 жніўня на гэтай тэрыторыі ўступаў ў сілу парадак яе часовага кіравання, у адпаведнасці з якім асаблівая ўвага надавалася выкарыстанню мясцовай рабочай сілы [10, Арк. 28–29]. На тэрыторыі Усходняй Прусіі, у тым ліку ў акрузе Беласток, уступалі ў сілу дырэктывы па вядзенні гаспадаркі, якімі ўводзіліся новыя тарыфныя нормы ў дачыненні да мясцовай рабочай сілы. Уводзілася паніжаная шкала аплаты, якая складала 70% ад агульна прадугледжаных акладаў і заработнай платы, што дзейнічалі на тэрыторыі Усходняй Прусіі. У выпадку паспяховага выканання работы прадугледжваліся грашовыя даплаты, якія не маглі перавышаць 85% ад вызначай тарыфнай аплаты. У будаўнічай галіне і на іншых работах будаўнічага профілю, а таксама ў металаапрацоўцы гэта даплата магла павялічвацца на 15% ад прадугледжанай пагадзіннай аплаты працы [11, Арк. 45–46].

Рабочыя, якія выконвалі работу неналежным чынам і яе вынікі не адпавядалі агульным патрабаванням, павінны была дэпрэміравацца ў адпаведнасці з уведзенымі нормамі. Пры гэтым сума грашовага спагнання вызначалася ў адпаведнасці з каэфіцыентам паніжэння працоўнай актыўнасці. Сярод іншых тарыфных норм прадугледжваліся таксама здзельная і

акордная аплаты. Пры прэміяльнай аплаце рабочы мог атрымліваць на 20% вышэй, чым за выкананне толькі прадугледжаных рабочых норм.

Для яўрэйскай рабочай сілы ўводзіліся асобныя расцэнкі, якія складалі 60% ад агульных тарыфаў, дзеючых на тэрыторыі Усходняй Прусіі, з якіх 50% павінны былі пералічвацца ў касу камісарыята. У месцах, дзе ствараліся гета, заробак па распараджэнні акруговага камісара маглі пераводзіць юдэнрату. Пры гэтым занятасць яўрэяў не абумоўлівалася аніякімі працоўным дагаворам. У выпадку парушэння палажэнняў распараджэння з яўрэяў прадугледжваецца грашовае спагнанне [11, Арк. 46].

З 1 верасня 1941 г. на тэрыторыі акругі Беласток уступалі ў сілу загад аб "новых расцэнках" работы мясцовага насельніцтва ў вытворчай сферы і занятых у хатняй гаспадарцы [12, Арк. 22–22 адв.]. Рэгуляванне выплат для мясцовага насельніцтва, якое ў дакуменце ўжо падзялялася на палякаў і беларусаў, адбывалася праз увядзенне паніжаных тарыфных ставак, якія дзейнічалі на ўсёй эканамічнай прасторы Усходняй Прусіі, адпаведна якім прадугледжвалася выплата заробку не вышэй за 70% ад заробку нямецкіх рабочых. Паводле ўведзеных "новых расцэнак" яўрэйскія рабочыя атрымлівалі такое ж матэрыяльнае заахвочванне як і мясцовае насельніцтва, за выключэннем 50% заробку, які пералічваўся на рахунак акруговага камісарыяту. У тых месцах, дзе існавалі гета заробак па ўказанні мясцовага органа ўлады мог пераводзіцца юдэнрату. З дакумента вынікала, што агульнаму 12%-му падатку падлягалі польскія, беларускія і яўрэйскія рабочыя [12, Арк. 22 адв.].

У сувязі з тым, што ў акрузе Беласток аднаўлялі дзейнасць асобныя тэкстыльныя вытворчасці, прадпрыемствы хімічнай індустрыі, табачная фабрыка, гарбарныя цэхі і маслабойні, прадугледжвалася ўвядзенне таксама спецыяльных тарыфных расцэнак. Напрыклад, для гарбарнай вытворчасці ўводзіліся такія пагадзінныя тарыфы: для кваліфікаваных рабочых звыш 22 гадоў – 0,46 RM, рабочы з вопытам працы – 0,40 RM, некваліфікаваныя рабочыя – 0,35 RM. У іншых галінах гэтыя расцэнкі складалі ад 0,40 RM для кваліфікаваных рабочых да 0,32 RM – для некваліфікаваных рабочых. Падлеткі ніжэй 16-ці гадоў атрымлівалі за некваліфікаваную работу толькі 0,15 рэйсхмаркі, тады як падлеткі да 15 гадоў – 0,13 RM [13, Арк. 25].

Для розных катэгорый рабочых былі ўстаноўлены асобныя тарыфныя нормы. Так, пагадзінная аплата працы жанчын-прыбіральшчыц (польскага) паходжання першага году працы складала 0,18 RM, тады як работніца з 10-гадовым вопытам атрымлівала практычна ўдвая больш [14, Арк. 11]. Вартаўнікі за гадзіну працы незалежна ад ўзросту атрымлівалі 0,28 RM [15, Арк. 10–10 адв]. З дакументаў другога гаспадарчага 1942/43 года вынікае, што ў металаапрацоўцы мясцовы персанал падзяляўся на 7 рабочых груп, куды ўваходзілі і яўрэі. Пры гэтым тарыфныя расцэнкі прадугледжвалі выкарыстанне на простых работах падлеткаў да 15 гадоў. Гадзіна працы на вытворчасці ацэньвалася для польскага і беларускага насельніцтва 0,13 (для яўрэяў – 0,12 ) RM, тады як для дарослых гэты тарыф складаў 0,32 (0,31)

RM. Некваліфікаваныя работы, якія патрабавалі большых фізічных высілкаў, аплачваліся адпаведна 0,15 (0,14) RM за гадзіну працы. Для выканання работ, якія патрабавалі адпаведнай кваліфікацыі, прыцягвалася мясцовая рабочая сіла пачынаючы ад 16 да 18 гадоў, якія атрымлівалі за гадзіну працы 0,22 (0,21) RM, тады як дарослыя рабочыя 0,34 (0,33) RM. Калі мясцовы кваліфікаваны рабочы за работу атрымліваў у гадзіну 0,40 RM (яўрэй – 0,39), дык для 7 групы гэтыя тарыфы складалі 0,52 (0,51) RM адпаведна [16, Арк. 17–17 адв.].

У гандлі тарыфныя нормы датычыліся дзвюх працоўных груп. Да першай адносіліся тыя, хто выконваў простую работу машыністак, справаводаў, стэнаграфістаў (да 140 знакаў у хвіліну). Персанал для працы ў канторы на першым годзе працы атрымліваў за гадзіну 0,60 RM (яўрэі – 0,51), з 9-ці гадовым і вышэй вопытам працы – 1,26 RM (яўрэі – 1,08). У другой групе, якая падзялялася на мужчын і жанчын, былі ўключаны бухгалтары, стэнаграфісты (якія запісвалі звыш 140 знакаў у хвіліну), калькулятары, экспедытары, загадчыкі складоў і інш.: для мужчын дзейнічала тарыфная сетка з аплатай за гадзіну працы на першым годзе працы 0,74 RM (0,63), з 9-гадовым стажам гэта складала 1,40 RM (1,20); для жанчын – 0,66 (0,57) і 1,40 (1,08) RM. Пры гэтым прадугледжвалася 15% тарыфная надбаўка для тых, хто дасягаў высокіх паказчыкаў працы [16, Арк. 18]. У будаўнічай галіне, дзе работы выконвала будаўнічая фірма "Gollow und Sohn", дзейнічалі свае тарыфы, якія прадугледжвалі аплату працы нямецкім рабочым, фольксдойчэ і мясцовым рабочым. Калі нямецкі слесар за гадзіну працы атрымліваў 0,93 RM, фольсдойчэ – 0,76, дык мясцовы слесар толькі палову ад тарыфаў нямецкага слесара – 0,47,5 RM [17, Арк. 38]. У другой будаўнічай фірме, якая займалася будоўляй мастоў у Гродна, расцэнкі мясцовых муляроў, слесараў і простых рабочых былі наступныя: пагадзінная аплата для першых складала 0,43 RM, для другіх – 0,43, для трэціх – 0,34 RM [18, Арк. 40]. У майстэрні па рамонту тэхнікі і матораў, якая ў Гродна з'яўлялася філіялам дюсельдорфскай фірмы, расцэнкі для мясцовых рабочых складалі: токар – 0,50, слесар – 0,46, слесар-плавільшчык – 0,46, свідравальшчык – 0,39, манцёр – 0,55, фрэзероўшчык – 0,45, шліфавальшчык – 0,46 RM. Мясцовы майстар рамонтнай майстэрні меў месячны заробак 195,50 RM, бухгалтарка – 138 рэйхсмарак [19, Арк. 91].

Для дарослых, хто быў заняты ў хатняй гаспадарцы, працаваў кладаўшчыкамі, кучарамі, вахцёрамі, упакоўшчыкамі пагадзінная аплаты складала 0,36 RM, тады як падлеткі да 16 гадоў – 0,15 RM; кваліфікаваныя надомнікі, апальшчыкі, майстры, прарабы, машыністы маглі атрымліваць 0,40 RM, у 16-гадовым узросце – 0,24 RM; шафёры другога класа – 0,43 (трэцяга – 0,41) RM; для слесараў, сталяроў, цесляроў і іншых ва ўзросце звыш 21 года, хто выконваў кваліфікаваную працу, пагадзінная тарыфная норма складала 0,43, для маладзейшых за 20 гадоў – 0,35 райхсмаркі [15, Арк. 10 адв.]. Асобныя расцэнкі былі ўведзены для дзяцей: калі колькасць працуючых дзяцей не перавышала чатырох чалавек, аплата кожнага

вызначалася не менш 3 пфеніга за гадзіну; у выпадку, калі дзяцей было больш за пяць дзяцей, то ў тыдзень іх заробак павінен быў складаць 2,30 RM, ці 10 рэйхсмарак у месяц. Пры гэтым працоўны тыдзень дзяцей не павінен быў перавышаць 46 гадзін [20, Арк. 9 адв.].

Пытаннямі ўліку працаздольнага насельніцтва і яго размеркавання на дзеючых прадпрыемствах акупаванага горада Гродна з восені 1941 г. займалася біржа працы. Паводле загаду аб выкарыстанні і аплаце работы яўрэяў ад 18 верасня 1941 г., яўрэйская рабочая сіла накіроўвалася на работы выключана праз біржу працы. Гэтым пытаннем займаўся спецыяльны біржавы аддзел, у пераліку абавязкаў якога была таксама выдача яўрэям працоўных пасведчанняў. Як вынікае з дакументаў біржы працы ў Гродна, асобы яўрэйскай нацыянальнасці ад 15 да 70 гадоў з'яўляліся выканаўцамі розных работ [21, Арк. 27, 36 адв.]. Паводле лістоў уліку яўрэйскай рабочай сілы, размешчанай у двух гета ў Гродна, да сярэдзіны лістапада 1941 г. з працаздольных яўрэяў былі сфарміраваны асобныя рабочыя групы, укамплектаваныя вязьнямі гета з улікам іх прафесійнага вопыту. Праз год пасля стварэння двух гарадскіх гета ў акрузе Гродна на розных работах працавалі 3597 яўрэйскіх кваліфікаваных спецыялістаў і 2553 яўрэйскіх некваліфікаваных рабочых. На асобных прадпрыемствах горада вытворчасць у значнай ступені залежала ад працы яўрэяў [22, Арк. 18–19].

Біржа працы ў Гродна забяспечвала працоўнай сілай толькі у тым выпадку, калі былі своечасова пададзены заяўкі аб неабходнай рабочай сіле з указаннем патрэбнай рабочай сілы (кваліфікаванай, вопытных ці простых рабочых). Як згадвалася ў паведамленні, разасланым біржай працы ў адрас усіх гарадскіх службаў і дзеючых прадпрыемстваў, з канца красавіка 1942 г. [23 Арк. 4] кіраўнікам прадпрыемстваў неабходна было зыходзіць з таго, што рабочы дзень для яўрэяў павінен складаў 10 гадзін. Паводле распараджэння, яўрэі атрымлівалі заработную плату нараўне з мясцовым насельніцтвам, але жанчыны маглі атрымаць толькі 75% ад мужчынскага заробку. Налічэнне заробку павінна спачатку весціся з улікам прадугледжаных падаткаў, да таго ж абавязковаму ўтрыманню падлягалі 50% заробку. Сума пералічвалася напрыканцы кожнага разліковага перыяду ў акруговую ашчадную касу (для Гродна быў вызначаны спецыяльны рахунак пад № 3, за рысай гораду – рахункі мясцовых камісарыятаў). Рэшткі заробку, якія заставаліся пасля абавязковых адлічэнняў, маглі выдавацца яўрэям на рукі [23, Арк. 4].

З новай "Інструкцыі аб выкарыстанні і аплаце яўрэйскай рабочай сілы" вынікала наступная тарыфная сетка аплаты. Пры гэтым жанчыны атрымлівалі толькі 75% ад вызначаных тарыфных нормаў. У выпадку харчовага забеспячэння на рабочым месцы, з яўрэяў вылічвалі 0,80 RM, абед каштаваў 0,40 RM, сняданак і вячэра – адпаведна па 0,20 RM. У інструкцыі таксама значылася, што выплата заработнай платы яўрэям забараняецца [23, Арк. 4].

У пачатку верасня 1942 г. біржа працы ў Гродна праводзіць уніфікацыю заработнай платы для мясцовага насельніцтва, занятага на розных работах.

У адпаведнасці з распараджэннем аб рэгуляванні рабочых умоў для неарыйскага насельніцтва ад 1.7.1942 г., замацоўвалася палажэнне, згодна якому павінна была захоўвацца 70% мінімум заработнай платы з максімальнай 15% надбаўкай. У дачыненні да яўрэйскага насельніцтва захоўваліся раней устаноўленыя нормы аб выплаце не больш за 60% заробку. Мясцовая мужчынская рабочая сіла ад 21 гадоў падзялялася на 3 рабочых групы (А – кваліфікаваныя рабочыя, В – рабочыя з вопытам працы, С – некваліфікаваныя рабочыя). Для кожнай групы пагадзінная заработная плата пры нармальнай рабочай норме складала адпаведна 0,46, 0,39 і 0,35 RM. У выпадку перавыканання нормаў і павышанай аплаты выкананай работы дзейнічалі наступныя пагадзінныя тарыфы, адпаведна: 0,55, 0,47 і 0,43 RM. Юнакі да 21 года і падлеткі мелі іншыя нормы аплаты. Так, 20 гадовы юнак мог атрымаць у залежнасці ад рабочай катэгорыі ў першым выпадку толькі 0,41, у другім – 0,35 і ў трэцім – 0,32 RM. Для жанчын гэтыя нормы былі значна ніжэйшыя і складалі 0,26 RM, тады як для 20-гадовых дзяўчат гэты тарыф складаў толькі 0,23 RM за гадзіну працы [24, Арк. 52–52 адв.].

Выкананне інструкцыйных указанняў аб аплаце работы мясцовым рабочым і пералічаных падатках пастаянна трымаў на кантролі акруговы камісар Гродна. Так, напрыклад, прыватная фірма Вілі Кергель, якая займалася продажам паперы і пісьмовых рэчаў, паведамляла аб тым, што на працягу трох першых месяцаў 1942 г. у ёй працавалі 6 мясцовых рабочых, якім за гэты перыяд часу, як вынікае з разліковых дакументаў, былі зроблены выплаты агульным коштам 815 рэйхсмарак: з іх былі пералічаны падаткі ў суме 97,8 RM [25, Арк. 57]. У разліковых ведамасцях фінансавага аддзелу адной з нямецкіх часцей зафіксавана, што пачынаючы з лістапада 1941 г. і да сярэдзіны красавіка 1942 г. на работах штомесячна выкарыстоўваліся ад 13 да 33 яўрэяў. На працягу паўгода імі была зароблена сума ў 5211,93 RM, поўнасцю пераведзеныя на рахунак акруговай касы Гродна [26, Арк. 57]. Гродзенскае зямельнае таварыства паведамляла, што з лістапада 1941 г. па красавік 1942 г. на розных работах штомесячна былі заняты ад 86 да 204 чалавек, якім за гэты перыяд быў выплачаны заробак у суме 73 022,97 RM [27, Арк. 63].

З дакументальных матэрыялаў бачна, што з першых месяцаў акупацыі германскія ўлады спрабавалі пераўтварыць мясцовую працоўную сілы ў важны фактар германскай эканамічнай палітыкі на тэрыторыі акругі Беласток, у тым ліку на тэрыторыі Гродзеншчыны. Калі на занятых усходняй тэрыторыі з 5 жніўня 1941 г. адбылося ўвядзенне ўсеагульнай працоўнай павіннасці для мясцовага насельніцтва ва ўзросце ад 18 да 45 гадоў, дык на тэрыторыі акругі Беласток з 1 красавіка 1942 г. працоўная павіннасць уводзілася ў дачыненні да ўсіх жыхароў акругі ва ўзросце ад 14 да 60 гадоў [28, Арк. 168]. З мэтай кантролю за гэтым усё мясцовае насельніцтва павінна было атрымаць працоўную карту, у якой меўся спецыяльны пункт аб занятасці. Працоўная карта ўтрымлівала штомесячныя паметкі аб выплаце заработнай платы. Праз год, калі значна абвастрылася сітуацыя з рабочай

сілай, патрэба ў якой значна ўзрасла, да ліку працаздольных былі таксама аднесены хатнія гаспадыні і дзеці ва ўзросце 12–14 гадоў [29, Арк. 169].

Асабліва напружанае становішчы з выкарыстаннем мясцовай рабочай сілы назіралася ў асобных прамысловых галінах горада з лета 1942 г., калі біржа працы ўжо не забяспечвала заяўкі на рабочых будаўнічых спецыяльнасцей, асабліва па мулярах і цеслярах, занятых на будаўнічых работах у лакаматыўным дэпо, на тытунёвай фабрыцы і малаказаводзе, а таксама на рамонтных работах [30, Арк. 32]. У сувязі з неабходнасцю правядзення летніх работ на чыгунцы акруговы камісар аддаў распараджэнне аб змяншэнні агульнай колькасці муляроў і цесляроў, занятых на розных прадпрыемствах горада з мэтай іх перадачы на важныя ваенныя аб’екты. Спецыялісты гэтай кваліфікацыі прыцягваліся нават з асобных нямецкіх фірмаў [30, Арк. 32]. У такіх умовах актыўна выкарыстоўвалася праца яўрэйскай рабочай сілы, якія былі задзейнічаны ў розных нямецкіх фірмах, у тым ліку: у дрэваапрацоўчай фірме Петэра Рупеля, паліўнай фірме Карла Кунтэра, будаўнічай фірме Карл Вітрок, тэхнічным бюро Р.Рэпецкі і В.Пера, а таксама на работах у дыстанцыі чыгункі-1, гандлёвых фірмах, вайсковых службах, гарадской камендатуры вермахта і інш. [31]. Асаблівае значэнне фірмы і службы надавалі яўрэйскім кваліфікаваным рабочым, якія займаліся выкананнем розных работ для германскага вермахта [32, Арк. 2]. З мэтай максімальнага выкарыстання мясцовай рабочай сілы былі ўстаноўлены рабочыя графікі, у якіх працягласць рабочага тыдня складала ў асноўным 54,5 гадзіны, што азначала працягласць штодзённага рабочага дня ў 9,5 гадзін, у суботу – 7 гадзін [33, Арк. 9].

Як вынікае з дакументаў, пытанні аб рэгуляванні выкарыстання мясцовай рабочай сілы знаходзіліся пад пастаянным кантролем біржы працы ў Гродна. У сярэдзіне восені 1942 г. пытанне з забеспячэннем рабочай сілай на прадпрыемствах акупаванага горада абвастраецца ў яшчэ большай ступені [34, Арк. 120]. У выпадку, калі на якой небудзь вытворчасці часова выяўлялася часткова занятая рабочая сіла, яна павінна была тэрмінова накіроўвацца на тыя працоўныя месцы, дзе ў ёй была вострая патрэба. Увосень 1943 г. на тэрыторыю горада перамяшчаюцца ваенная вытворчасць і розныя службы вермахта. Гэта прывяло да ўскладнення сітуацыі з рабочай сілай у горадзе. Асабліва востра адчуваўся недахоп кваліфікаваных рабочых і спецыялістаў. Таму ў снежні 1943 г. біржай працы быў выдадзены цыркуляр, адпаведна якому на ўсіх гарадскіх прадпрыемствах тэрмінова праводзіўся абавязковы ўлік усіх прафесійна падрыхтаваных рабочых [35, Арк. 169].

Для нямецкіх фірмаў, якія працавалі ў Гродна з першага года акупацыі адным з важных пытанняў з’яўлялася павышэнне прадукцыйнасці працы мясцовых рабочых. Так, на двух дрэваапрацоўчых фірмах “Peter Ruppel” і “Herbert Philipp” вёўся пастаянны пошук спосабаў для заахвочвання рабочых. Калі на першай фірме, дзе ў маі 1944 г. працавалі 154 мясцовыя рабочыя (з іх 66 былі кваліфікаванымі, 18 – з вопытам працы, 59 – былі некваліфікаванымі, 7 – лічыліся вучнямі і 4 канторскія служачых), гэта ўдалося дасягнуць

дзякуючы грашоваму заахвочванню, прынамсі таму, што мясцовыя рабочыя атрымлівалі сярэднюю тарыфную стаўку нямецкіх рабочых, дык у другой фірме, у якой былі заняты 280 мясцовых рабочых (з якіх 12 – сталяроў, 40 – кваліфікаваных станочнікаў, 40 – рабочых з вопытам работы і 179 – некваліфікаваных рабочых і 4 канторскія работнікі), павышэнне вытворчасці працы было дасягнута на аснове рацыяналізацыі умоў працы, а таксама ў выніку праведзеных пэўных арганізацыйных мер: імі сталі з аднаго боку ўвядзенне дадатковых абедаў, а з другога – забеспячэнне рабочых адзеннем і абуткам. Вынікам з'явілася тое, што сярэдні ўзровень вытворчасці працы дасягала палова рабочага калектыву пры працягласці рабочага дня ў 10½ гадзін. Толькі 3% не спраўляліся з сярэдняй працоўнай нормай, тады як 47 – яе перавышалі, прычым 42% - перавышалі яе амаль на трэць, а 5% – напалову [36, Арк. 27–27 адв.]. Зазначым, што такія факты мелі месца не ў першыя дні германскай акупацыі, а за паўтара месяца да вызвалення Гродна ад нямецкіх захопнікаў.

Як сведчыць спіс служачых, якія працавалі ў 22 аддзелах гарадской управы Гродна, датай пачатку работы гэтага органа акупацыйнай улады з'яўлялася 25 чэрвеня, калі быў створаны агульны аддзел колькасцю ў 27 чалавек. У пачатку 1942 г. агульная колькасць работнікаў, якія былі заняты на розных работах ў гарадской управе, складала 588 чалавек [37, Арк. 20–31 адв.].

Сярод тых, хто працаваў у Гродна падчас акупацыі, былі і жыхары прылеглых ваколіц. Так, напрыклад, на адным з вайсковых складоў, дзе рабочымі, вартаўнікамі, сталярамі, сарціроўшчыкамі працавалі 57 рабочых, амаль палову складалі жанчыны. Працавалі тут у асноўным жыхары з прылеглых раёнаў: Румлёўкі, Кільбазіна, Скамаронак, Чэхаўшчызны і вёсак – Гнойніца, Кашэўнікі, Малахавічы, Пагараны, Солы. Старэйшым па ўзросце сярод гэтай групы работнікаў быў столяр 1891 года нараджэння, а маладзейшым – двое рабочых 1927 года [38, Арк. 126–126]. У той час як са 183 рабочых, занятых у канцы 1941 г. на тытунёвай фабрыцы, практычна ўсе пражывалі ў Гродна [39, Арк. 2–4 адв.].

Асобае месца сярод занятых на работах у гарадской гаспадарцы займалі рамізнікі. У студзені 1942 г. гарадскім камісарам быў выдадзены загад, адпаведна якому ў Гродна ўводзілася рамізніцкая служба. У горадзе павінна было быць 20 рамізніцкіх брычак, для якіх былі вызначаны 3 асноўных месцы знаходжання: на вуліцы № 234 – 10 брычак, перад чыгуначным вакзалам – 5 і на царкоўнай плошчы – 5 брычак. У выпадку прыбыцця цягніка на плошчы перад чыгуначным вакзалам могуць знаходзіцца да 8 павозак. Для аплаты правозу ўводзіліся тарыфы: мінімальная такса складала 0,75 RM, столькі каштаваў і правоз на кароткі адрэзак шляху. Пры працягласці паездкі да трох чвэртак часу гэта каштавала 1,50 RM, працягласць руху цягам адной гадзіны каштавала 2,0 RM. Кожная наступная гадзіна каштавала 1,5 RM. Кожная гадзіна прастою каштавала 1 рэйхсмарку, але пры той умове, што тэрмін чакання быў не меншы за 20 хвілін. Такія кошты ўжываліся ў тым выпадку,

калі рамізнік дастаўляў не больш за 2 пасажыраў. Калі брычку выкарыстоўвалі больш за 2-х пасажыраў, праводзілася даплата ў памеры 25% ад агульнага кошту [40, Арк. 1–1 адв.].

Як вынікае з выяўленых на цяперашні час дакументаў, мясцовае насельніцтва ў абставінах германскай акупацыі было пастаўлена з аднаго боку ў жорсткія ўмовы пошуку любых шляхоў і сродкаў для выжывання, а з другога – з’яўлялася не толькі аб’ектам татальнага гаспадарчага выкарыстання мясцовай рабочай сілы, але і суб’ектам германскай эканамічнай палітыкі на акупаванай тэрыторыі Гродзеншчыны. Атрымлівалася, за гады акупацыі з тэрыторыі Гродзенскай акругі на прымусовая работы ў германскі рэйх былі вывезены 18 589 чалавек [1, С. 367], тады як агульная колькасць мясцовых жыхароў, хто быў прыцягнуты на месцы да працы, складала 75087 чалавек [2, Арк. 39].

Падсумоўваючы сказанае, неабходна звярнуцца не толькі да ўпершыню ўведзеных дакументальных фактаў, датычных адной з маладаследаваных старонак гісторыі Гродзеншчыны. Важна выключна пад навуковым вуглом паглядзець на акрэсленую праблематыку і ўбачыць фактычныя наступствы прыцягнення мясцовага насельніцтва да працы ў гады германскай акупацыі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Ярмусік Э.С. Эканамічная, рэлігійная і нацыянальная палітыка акупантаў / Э.С. Ярмусік // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Гродна (Беларус. Энцыкл.); Рэд. кал.: Г.П. Пашкоў, Я.М Жабрун, І.П. Крэнь і інш.. – Мінск: БелЭн, 1999.
2. Дзяржаўны архіў Гродзенскі вобласці (далей – ДАГВ). Aufstellung der eingesetzten Arbeitskräfte des Arbeitsamts Bezirk Grodno (o.D.). – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 120.
3. ДАГВ. Спісы працаздольнага насельніцтва Гродзенскага ўезда на 22.10.1943 г. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 41.
4. Указ рэйхсмаршала вялікагерманскага рейха, упаўнаважанага па чатырохгадовым плане ад 31 ліпеня 1941 г. // Новікаў С.Я. Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941–1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў / С.Я. Новікаў. – Мінск, 2002.
5. Федэральны ваенны архіў Германіі (далей ВА-МА). – F 43390. KTB Wi Stab Ost: Vierzehntagebericht Wi Stab Ost v. 12.7.1941.
6. Gerlach Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941–1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg, 1999.
7. ВА-МА. – F 43384. KTB Wi Stab Ost v. 21.7.1941.
8. ДАГВ. Richtlinien über die vorläufige Regelung der Lohn- und Arbeitsbedingungen im Bereich des Befehlshabers für das rückwärtige Heeresgebiet Mitte (Neue Fassung) v. 7. August 1941. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 1.

9. ДАГВ. Richtlinien über die vorläufige Regelung der Lohn- und Arbeitsbedingungen für von deutschen Diensstellen beschäftigten Zivilpersonen. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 1.
10. ДАГВ. Verordnung über Lohngestaltung im Bezyrk Bialystok vom 18. September 1941. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 28.
11. ДАГВ. Verodnung über die Lohngestaltung im Bezirk Bialystok. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 28.
12. ДАГВ. Anordnung zur Lohngestaltung. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 4.
13. ДАГВ. Lohngestaltung in Bezirk Bialystok, von 26.8.1941. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 4.
14. ДАГВ. Tarifordnung für Putzmacherhandwerk im Wirtschaftsgebiet Ostpreußen. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 5.
15. ДАГВ. Tarifordnung für die gewerblichen Gefolgschaftsmitglieder im Handelsgewerbe und den verwandten Gewerbezweigen im Wirtschaftsgebiet Ostpreußen. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 5.
16. ДАГВ. Lohngestaltung in der Metallindustrie des Bezirkes Bialystok, v. 13.11.1942. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 34.
17. ДАГВ. Gehalts- ubd Lohnüberprüfung bei der Brückenbaufirma „Gollow und Sohn“ in Grodno v. 15.2.1943. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 34.
18. ДАГВ. Gehalts- und Lohnüberprüfung bei dem Brückenbauzug „Gerhard Pinnov“, Baustelle Grodno, v. 16.2.1943. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 34.
19. ДАГВ. Löhne für einheimische Gefolgschaft, v. 20 Januar 1944. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 34.
20. ДАГВ. Kinderzuschläge. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 5.
21. ДАГВ. Liste der von der Stadtverwaltung Grodno (Technische Abteilung) dienstverpflichteten Juden ab 16. November 1941. – Ф. 2. – Воп. 1. – Спр. 4.
22. ДАГВ. Аб арганізацыі гаспадарчых работ у сувязі ў правядзеннем акцыі ў адносінах яўрэяў, Гродна, 9 снежня 1942 г. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 180.
23. ДАГВ. Vorschriften über den Arbeitseinsatz und die Entlohnung der Juden. – Ф. 2. – Воп. 1. – Спр. 20.
24. ДАГВ. Entlohnung der im öffentlichen Dienstbeschäftigten nichtdeutschen Arbeiter im Bezirke des Arbeitsamtes Grodno. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 28.
25. ДАГВ. Schreiben Firma „Großvertrieb von Presseerzeugnissen“ Willi Kärgel, v. 29. April 1942. . – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 103.
26. ДАГВ. Beschäftigung von nichtdeutschen Arbeitskräften v. 14.5.1942. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 103.
27. ДАГВ. Beantwortung auf die Fragebogen des Kreiskommissars von 10. April 1942. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 103.
28. ДАГВ. Regelung des Arbeitseinsatzes. – Ф. 2. – Воп. 1. – Спр. 20.
29. ДАГВ. Heranziehung aller einsatzfähien Kräfte. – Ф. 2. – Воп. 1. – Спр. 20.
30. ДАГВ. Schreiben von Kreiskommissar Kreises Grodno an den Herrn Bürgermeister – Stadtbauamt – in Grodno, v. 30. Juli 1942. – Ф. 2. – Воп. 1. – Спр. 20.

31. ДАГВ. An das Arbeitsamt-Judenvermittlung. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 30. – Арк. 51; – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 30. – Арк. 57; – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 30. – Арк. 72; – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 30. – Арк. 74; – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 30. – Арк. 81; – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 30. – Арк. 82; – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 30. – Арк. 89; – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 30. – Арк. 90; – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 30. – Арк. 93.
32. ДАГВ. Schreiben des Technisches Büro „R.Rzepecki u. W. Pera“ an das Arbeitsamt in Grodno, v. 17.11.1941. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 2.
33. ДАГВ. Rundschreiben des Arbeitsamtes in Grodno, v. 9.4.1943. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 34.
34. ДАГВ. Regelung der Arbeitseinsatzes, v. 31. Oktober 1942. – Ф. 2. – Воп. 1. – Спр. 20.
35. ДАГВ. Gewinnung zusätzlicher Facharbeiter in Grodno, v. 18. Dezember 1943. – Ф. 2. – Воп. 1. – Спр. 20.
36. ДАГВ. Leistungssteigerung in der Holzindustrie in Grodno, v. 30.5.1944. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 11.
37. ДАГВ. Verzeichnis der Beamten und Angestellten der Stadtverwaltung Grodno, v. 25.2.1942. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 181 (падлікі аўтара).
38. ДАГВ. Verzeichnis der Arbeiter des Heeresgutes Grodno (o.D.). – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 423.
39. ДАГВ. Verzeichnis der Arbeiter der Tabakwerkes Grodno (o.D.). – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 18.
40. ДАГВ. Droschkenordnung für die in der Stadt Grodno verkehrenden Pferdedroschken, v. 8. Januar 1942. – Ф. 2. – Воп. 1. – Спр. 76.